# СЕКЦИЯ 1

# ЛИТЕРАТУРА В РЕЦЕПЦИИ БУДУЩИХ УЧИТЕЛЕЙ

## МАСТАЦКАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ ТЭМЫ ДЗЯЦІНСТВА Ў ПРОЗЕ ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ (НА МАТЭРЫЯЛЕ АПАВЯДАННЯЎ ЦЁТКІ, ЯКУБА КОЛАСА І ЗМІТРАКА БЯДУЛІ)

*К. А. Валеўская*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філал. навук, дацэнт*

**Анатацыя.** На матэрыяле апавяданняў Цёткі, Якуба Коласа і Змітрака Бядулі даследуецца спецыфіка мастацкага ўвасаблення тэмы дзяцінства ў прозе пачатку XX стагоддзя. Паказваецца агульнае і адметнае ў падыходах розных пісьменнікаў да раскрыцця гэтай тэмы.

**Ключавыя словы:** Цётка; Якуб Колас; Змітрок Бядуля; “Міхаська”; “Сірата Юрка”; “Малыя дрывасекі”; тэма дзяцінства; вобраз дзіцяці.

У цэнтр увагі пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя, якім наканавана было стаць нацыянальнымі класікамі, неаднаразова трапляла тэма дзяцінства. Прычым нярэдка яна раскрывалася ў драматычным, а то і трагічным ключы, як у апавяданнях “Сірата Юрка” Якуба Коласа, “Міхаська” Цёткі, “Малыя дрывасекі” Змітрака Бядулі.

Так, у апавяданні **“Сірата Юрка”** Якуба Коласа расказваецца пра цяжкае жыццё маленькага хлопчыка, што страціў маці і застаўся з бацькам, які вырашыў зноў ажаніцца. Са з’яўленнем новай маці Юрка адчувае сваю адарванасць ад сям’і. Аўтар прытрымліваецца народнай традыцыі і падкрэслівае палярызацыю персанажаў – у творы ёсць злая мачыха і добры сірата. Мачыха ўяўляе сабой жорсткага чалавека, што не шкадуе чужое дзіця і часта яго крыўдзіць: *“Або мала ўшчувала яго мачыха? Ці не яго гэта плач напаўняў двор бадай не кожын дзень? Ці не ён, зняважаны і пакрыўджаны, сашчаміўшы зубы, ляжаў на цвёрдай пасцельцы, уткнуўшыся тварам у саламяную падушку, каб спыніць крык болю і ўтрымаць слёзы? Ці не яго гэта грудзі паліліся агнём жаласці і нявыказанай жальбы?”* [2].

Бацька Юркі зусім не прымаў удзелу ў жыцці хлопца, і гэта Якуб Колас падкрэслівае ў апошніх радках твора – той нават не паклапаціўся пра магілу

сына: “*За сялом на пагорку прыбавілася яшчэ магілка. Гэта пахавалі маленькага Юрку. Над яго магілкаю стаіць крыж. Яго паставіла цётка Тарэса”* [2].

Але быў у жыцці Юркі той чалавек, які любіў яго, як некалі любіла маці, – гэта цётка Тарэса. Цётка была “выратавальным кругам”, яна рабіла жыццё хлопчыка трохі весялейшым і цікавейшым. Тарэса разам з Юркам хадзіла ў лес і збірала розныя травы. Гэтыя падарожжы дапамагалі малому на час забыцца пра тое шэрае жыццё, што чакала яго ў сценах зусім не роднага дома: “*У святыя дні, бывала, цётка клікала Юрку і ішла з ім у лес збіраць розныя травы і зёлкі – цётка была крыху лекаркай. Гэтыя зборы былі для Юркі праўдзівым святам. Покі зойдуць у лес, то нагаворацца яны досыць. А Юрку многае цікавіла”* [2].

Аўтар праводзіць паралель паміж тым, як адчувае сябе малы сірата ў сям’і і сам-насам з прыродай, а менавіта з хвойкай. Хвойка ў творы адначасова сімвалізуе жыццё і смерць хлопчыка. Разам з хвойкаю Юрка адчуваў сябе спакойным, не такім адзінокім – яму здавалася, што гэта яго маці: *“Не, што ні кажы, а тут добра! І як гэта ён не ведаў такой прыўдалай хвойкі і гэтага мілага пагорка!”* [2]. Хвойка была адзіным сябрам хлопчыка, толькі яна трымала яго ў жыцці. Ссеклі хвойку – і разам з ёй “ссеклі” жыццё сіраты Юркі: даведаўшыся пра тое, што дрэўца больш няма, адзінокі хлопчык памірае.

Адзінота галоўнага героя падкрэсліваецца ўжо ў назве твора: сірата – гэта асоба, якая засталася без бацькоў. Аднак Юрка страціў толькі маці і застаўся з бацькам. Тым не менш аўтар называе яго сіратой, чым падкрэслівае драматычнае становішча, у якім знаходзіўся хлопчык – занядбаны і закінуты сірата пры жывым бацьку.

Трагедыю адзінокага і нелюбімага дзіцяці даследуе і Цётка ў апавяданні **“Міхаська”**. Галоўным героем таксама з’яўляецца хлопчык-сірата, які з самых першых хвілін жыцця застаўся без маці. Да таго ж хлопец нарадзіўся брыдкім, і людзі лічылі, што нічога з яго не выйдзе. *“У хлопчыка насок з добрую бульбачку, барада – брылем закручана, праз усенек левы тварычак чырвоная пляма радзімая. Адно вочка глядзіць у правы бок, другое – у левы”* [3, с. 108]. Маці перад смерцю спадзявалася на тое, што, нягледзячы на знешнасць, жыццё яе сына будзе шчаслівым, але адбылося ўсё інакш. Дзяцінства хлопчыка праходзіла ў запечку, куды яго засунула мачыха. Ніхто з ім не гуляў, ніхто з ім не меў зносін, але Міхаська гэтага нібы і не заўважаў, ён рос і радаваўся жыццю: “*Міхась пачаў лавіць сонейка за косы, а тое з прыпечка – гоц, ды за дзверы. Міхалюк у адной сарочцы ўдагонку на падворак: пазаплоткамі ляціць, цешыцца, смяецца”* [3, с. 108]. Як коласаўскі сірата Юрка каля сваёй хвойкі, Міхаська не заўважаў уласнай адзіноты на ўлонні прыроды.

Аднак падрослы хлопчык пачаў адчуваць усю жорсткасць людзей і ўласнае становішча сярод іх. Да таго ж яшчэ ў дзяцінстве ён перахварэў на воспу, і яго і так непрыгожы твар яшчэ больш пабрыдчэў: *“...аб Міхася твар хоць хрэн дзяры. Столькі вываратняў на ім воспа накачала”* [3, с. 109]. Але знешні выгляд адыходзіць на другі план, калі ў чалавека добрая душа.

Ці была яна такой у Міхаські? Вядома, была, аднак людзі не заўважалі гэтага і не давалі праявіцца яго прыроднай дабрыні, іх стаўленне да сіраты было даволі жорсткім.

З першых дзён жыцця ён цярпеў крыўду, здзекі, абыякавасць мачыхі, і гэта ўсё прычыняла яму такі боль, што ён сам стаў падобным да тых, хто быў для яго "ворагам": *"Міхась маўчаў, зубы сцяўшы, а ўпатайне ўсіх ненавідзеў. Кожнаму мсціў колькі мог: дзе каторага пастуха птушку асочаную з гнязда выпара, то торбачку з хлебам у балота закіне і чужую скаціну ў шкоду нажане"* [3, с. 109]. Даставалася не толькі людзям, але і жывёлам: *"Жывіна таксама не зазнала ад Міхася ласкі: бізуном рэзаў кожную скуру, Мацеевааму бычку рог скруціў, падцёлцы Канцавога Лукаша збіў клуб. Нат сорамна расказваць – такія ліхаты выкідваў"* [3, с. 109]. Здаецца, Міхаська стаў страшным не толькі знешне, але і ўнутрана. Аднак адбываецца падзея, якая дазваляе хлопцу праявіць свае лепшыя якасці.

Для паказу духоўнага свету персанажа, яго псіхалагічнай характарыстыкі Цётка, падобна Якубу Коласу, выкарыстоўвае такі мастацкі прыём, як "сяброўства" з прыродай. У стасунках са светам прыроды раскрываецца сапраўдны Міхаська. Сяброўства з жоравам дапамагло хлопцу стаць самім сабой. Міхаська выратаваў птушку і такім чынам знайшоў "родную душу". Жораў стаў адзіным блізкім сябрам хлопца. Яны мелі шмат агульнага: у іх абодвух не было больш нікога, хто б мог за іх заступіцца і зразумець усё, аб чым яны сумуюць: *"Міхась з жоравам вытварылі сабе нейкае асобнае жыццё, без слоў разумеюць адзін другога, з сабой не расстаюцца"* [3, с. 112].

Паколькі хлопец вельмі часта хварэў, то смерць не прымусіла сябе доўга чакаць – Міхаська памёр. Апошняе, што ён папрасіў у мачыхі, – даць яму жорава, каб развітацца са сваім "браткам" назаўсёды… Напэўна, адзінай істотай, хто сапраўды адчуў страту Міхаські, быў жораў – астаніх не цікавілі ні яго жыццё, ні яго смерць.

Праблему занядбанасці дзяцей у сям'і не пакінуў без увагі Змітрок Бядуля. На прыкладзе герояў апавядання **"Малыя дрывасекі"** пісьменнік паказаў, да чаго можа прывесці абыякавасць і жорсткасць бацькоў. Галоўнымі героямі твора з'яўляюцца два браты – дзесяцігадовы Цішка і васьмігадовы Халімон. Яны разам працуюць у лесе, выконваюць працу дарослых (іх бацька кульгавы, а сям'ю карміць неяк трэба). Змітрок Бядуля лаканічна, але вельмі ёмка характарызуе становішча гэтых дзяцей: *"Трудна жылося малым дрывасекам"* [1]. Цішка і Халімон радуюцца, калі ўдаецца падсілкавацца і не наракаюць на лёс: *"Добра, што хоць на полудзень маем па кавалку хлеба... Паваліўшы некалькі хвой, хлопчыкі ўзяліся шчыра грызці сухі хлеб. Вочы іх заіскрыліся, шчокі расчырванеліся... – Ого, есці, ого!.. Якая радасць!.."* [1].

У адрозненне ад Юркі і Міхаські хлопчыкі не сіроты, маюць абодвух бацькоў, але гэта не адмяняе іх адзіноты – у сям'і яны не адчуваюць ні пяшчоты, ні ласкі. Перад смерцю гэтым абдзеленым бацькоўскай любоўю дзецям трызніцца тое, чаго яны ніколі не мелі: *"І здаецца ім – сядзяць яны за сталом... Маці радуецца, што прыйшлі... Корміць іх цёплым праснаком...*

*Бацька пазірае на іх добрымі вачамі і лагодна ківае галавой. Пад'елі і палягли на палок каля печы... Котка лашчыцца да іх, і яны радасна заснулі...”* [1]. Бацькі, па ўсім відаць, не прымалі ўдзел у жыцці дзяцей. Для іх хлопчыкі сталі рабочай сілай, у іх не было пытанняў “ці не галодныя мае дзеткі?”, “ці не холодна ім?”, “ці не змарыліся яны?”. Дзеці ведалі пра нелюбоў бацькоў і баяліся іх гневу. Менавіта таму яны і засталіся ў лесе ў непагадзь: *“Усе дрывасекі разбегліся хутка дамоў, а Цішка з Халімонам баяліся, каб бацька не наракаў, што зарана прыйшлі з лесу...”* [1]. Маці і бацька пазбавілі хлопчыкаў дзяцінства. Аднак гэта не толькі іх віна, але і бяда: абставіны паўплывалі на тое, што сям'я апынулася ў такіх умовах.

Малыя дрывасекі вырашылі застацца ў лесе і перачакаць мяцеліцу. Яны лічылі, што дома таксама “холадна”, як і тут, у лесе. Толькі ў хаце іх будуць “абдаваць” гэтым “холадам” бацькі, якія пачнуць папракаць за тое, што яны пакінулі працу. Страх перад бацькамі быў мацнейшым за ўсе іншыя пачуцці – хлопцы замерзлі ў лесе і не вярнуліся дахаты.

Змітрок Бядуля таксама задзейнічаў пейзаж. Калі ў Якуба Коласа і Цёткі прыродныя карціны і “персанажы” падкрэслівалі адзіноту герояў, то тут пейзаж выкарыстоўваецца для кантрасту: *“Вынырнуў з-за хмар чырвоны месяц. Вакол яго мігаценіся зоркі і пазіралі весела на белую зямлю”* [1]. Апісанне “вясёлага” зімняга неба ўзмацняе трагічны фінал твора, а, магчыма, і неяк суцяшае чытача, бо дзве маленькія зорачкі – два памерлых хлопчыка – толькі цяпер знайшлі спакой.

Як бачым, беларускіх пісьменнікаў цікавілі турботы і беды маленькіх асоб. У творах яны паказвалі складаныя перажыванні герояў, ставілі актуальную і сёння праблему адказнасці дарослых за лёс дзяцей.

## Літаратура

1. Бядуля, З. Малыя дрывасекі [Электронны рэсурс] / З. Бядуля // Беларуская палічка : беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Zmitrok_Biadula/Malyja_dryvasieki.html. – Дата доступу: 11.03.2021.
2. Колас, Я. Сірата Юрка [Электронны рэсурс] / Я. Колас // Беларуская палічка : беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Jakub_Kolas/Sirata_Jurka.html. – Дата доступу: 11.03.2021.
3. Цётка. Выбраныя творы / Цётка ; уклад., прадм. В. Коўтун ; камент. С. Александровіча і В. Коўтун. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – 336 с.